вания и существующие в полном описании мира на правах альтернатив [2, с. 27]. По нашему мнению, это альтернативные способы представления действительности, выбор которых обусловлен установкой говорящего субъекта или наблюдателя. Как показывают примеры, потребителю медиапродукта предлагают лишь два варианта интерпретации действительности, когда как их может и должно быть гораздо больше. Это говорит о том, что потребителей медиапродукта заведомо делят на два лагеря, не давая возможности увидеть множество других вариантов, что, несомненно, противоречит принципам демократии (стимулировать плюрализм, многообразие в обществе, предоставлять возможность всем гражданам объединяться, открыто выражать свои интересы, находить путем компромиссов их равновесие, выражаемое в политических решениях), а также ставит под сомнение объективность и честность авторских интенций. Таким образом, речевые приемы, которые используют авторы, из воздействующих можно переквалифицировать в мунипулятивные, когда субъективное мнение представляется фактом объективной действительности.

### Библиографические ссылки

1. *Шмелева Т. В*. Смысловая организация предложения и проблема модальности // Актуальные проблемы русского синтаксиса / под ред. К. В. Горшковой, Е. В. Клобуковой. М. : Изд-во Моск. ун-та, 1984. Вып. 1. С. 78–100.
2. *Переверзев К. А*. Высказывание и ситуация: об онтологическом аспекте философии языка // Вопросы языкознания. М. : Наука, 1998. № 5. С. 24–52.

## ІНФАРМАЦЫЙНЫ ПАДСТЫЛЬ ГАЗЕТНАЙ МОВЫ: ЛІНГВІСТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

***Л. Г. Шасцярнёва***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*lilija.s0607@gmail.com*

У матэрыяле даецца лінгвістычная характарыстыка інфармацыйнага падстылю мовы газеты, даследуецца канстатацыя факта як асноўны тып маўленчай дзейнасці журналіста.

***Ключавыя словы:*** публіцыстычны стыль; інфармацыйны падстыль; канстатацыя факта; інфармацыйнае апісанне; інфармацыйнае апавяданне.

# INFORMATION FORM OF THE NEWSPAPER LANGUAGE: LINGUISTIC CHARACTERISTICS

***L. G. Shastsarneva***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: L. G. Shastsarneva (lilija.s0607@gmail.com)*

The material gives a linguistic description of the information background of the newspaper's language, examines the statement of fact as the main type of speech activity of a journalist.

***Key words:*** journalistic style; information background; statement of fact; information description; information story.

Даследаванні, прысвечаныя мове і стылю СМІ, складаюць значны пласт навуковай літаратуры. Найбольш значны ўклад у гэтую галіну даследаванняў унеслі такія вучоныя, як В. А. Вінаградаў, Р. В. Вінакур, А. А. Земская, В. Р. Кастамараў, Р. Я. Салганік, В. І. Іўчанкаў, Н. І. Клушына, Л. Р. Дускаева, і гэта навуковая сфера пастаянна папаўняецца і пашыраецца новымі працамі і імёнамі.

Сёння актыўна выкарыстоўваюцца ў навуковым ужытку такія паняцці, як газетна-публіцыстычны стыль, мова газеты, мова СМІ, мова масмедыя, медыялінгвістыка, медыястылістыка. Мова газеты (і мова СМІ) традыцыйна атаясамліваецца з газетна-публіцыстычным стылем, у якім рэалізуецца інфарматыўная функцыя і функцыя ўздзеяння.

Публіцыстычны стыль – сістэма моўных сродкаў, звязаная з грамадска-палітычнай сферай дзейнасці. Гэты стыль прызначаны для абслугоўвання палітычных, грамадска-эканамічных, культурна-масавых, спартыўных і іншых зносін. Асноўная функцыя публіцыстычнага стылю – паведаміць пра найбольш актуальныя тэмы і падзеі сучаснасці.

Інфармацыйны падстыль – гэта разнавіднасць публіцыстычнага стылю, дзе ў журналісцкіх тэкстах на першы план выступае інфарматыўная функцыя мовы. У журналісцкай практыцы склалася сістэма інфармацыйных жанраў, якія маюць асноўнай мэтай інфармаванне. Традыцыйна да іх адносяцца: інфармацыйная нататка, справаздача, рэцэнзія, карэспандэнцыя, анонс, рэпартаж і інш.

Для тэкстаў інфармацыйнага падстылю ўласцівы наступныя лінгвістычныя характарыстыкі:

1) безасабовая форма падачы матэрыялу;

2) адсутнасць элементаў хранатопу гаворачага;

3) імкненне да аб’ектыўнасці;

4) пазбаўленне тэксту ацэначнасці і элементаў суб’ектыўнага ўспрыняцця рэчаіснасці.

Як адзначае Т. С. Драняева, «індывідуальныя стылістычныя асаблівасці, аказіянальныя тропы і фігуры мовы супрацьпаказаны інфармацыйнаму падстылю газетнай мовы, для яго характэрная павышаная стандартызаванасць спосабаў выражэння» [1, с. 497]. У мове сучаснай газеты інфармацыйны падстыль існуе ў тэкстах двух тыпаў: інфарматыўнага апісання сацыяльна значных падзей і інфарматыўнага апавядання пра сацыяльна значныя падзеі: «*Навучальныя ўстановы горада і раёна (а гэта 15 школ, 12 дзіцячых садкоў, цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі) сустрэлі 1 верасня цалкам гатовымі да новага навучальнага года. У нашым раёне 2600 школьнікаў селі за парты ў гэтым годзе. З іх 208 першакласнікаў, якія ўпершыню пераступілі парог школы, каб акунуцца ў новы свет ведаў*» (Ляхавіцкі веснік, 01.09. 2020).

Канстатацыя (абазначэнне, называнне) факта – асноўны тып маўленчай дзейнасці журналіста, які выступае ў інфармацыйным падстылі.

Канстатацыя факта як моўная форма часцей за ўсё сустракаецца ў тэкстах навін: «*Да акцыі “Беларусь памятае. Памятаем кожнага”, прысвечанай 75-годдзю вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, далучыўся і Ляхавіцкі раённы камітэт грамадскага аб’яднання БРСМ*» (Ляхавіцкі веснік, 05.05.2020). Канстатацыя факта ў газетным дыскурсе можа ўяўляць сабой частку тэксту (інфармацыйнага або публіцыстычнага) або цэлы тэкст, займаючы самастойную пазіцыю на газетнай паласе ў выглядзе анонса, кароткай навіны: «*Як главы ў рамане. Ляхавіцкаму загсу сёлета спаўняецца 80 гадоў*» (Ляхавіцкі веснік, 07.04.2020).

Канстатацыя факта часта прадстаўлена ў выглядзе загалоўка:

*Старшыня Ляхавіцкага райвыканкама правёў прамую тэлефонную лінію; Пра малую радзіму і выніковасць работы. У мінулую пятніцу ў Ляхавіцкім раёне працаваў міністр юстыцыі Рэспублікі Беларусь; На першай сесіі раённага Савета дэпутатаў дваццаць восьмага склікання выбрана кіраўніцтва Ляхавіцкага райсавета; Прыёмныя пытанні. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў правёў у Ляхавіцкім раёне прыём грамадзян; Ляховичские спасатели поздравили коллегу-ветерана пожарной службы с юбилеем; В Ляховичской райбольнице появилась еще одна машина скорой помощи.*

Такім чынам, у інфармацыйным падстылі дзейнічаюць тры асноўныя моўныя формы – канстатацыя фактаў, інфарматыўнае апісанне і інфарматыўнае апавяданне. Вядучая роля ў газетным дыскурсе належыць фактаграфічным выказванням, якія могуць выступаць у якасці самастойнай тэкставай пазіцыі (загалаўка, анонса, цэлага тэксту).

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Дроняева Т. С.* Информационный подстиль // Язык СМИ как объект междисциплинарного исследования : учеб. пособие / отв. ред. М. Н. Володина. М. : Изд-во МГУ, 2003. С. 496–520.

## ПЕРСПЕКТИВЫ ИССЛЕДОВАНИЯ ОЧЕРКА КАК ЖАНРА В СИСТЕМЕ ДИСКУРСА

***Ю. В. Явинская***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*yavinska@mail.ru*

В статье обоснована актуальность изучения очерка как жанра в системе дискурса. Определены перспективы сопоставительного исследования очерков с помощью методов семиотического моделирования и дискурсного анализа текста на материале белорусских медиапроектов «НеОБЫЧАЙные деревни» и «Я живу».

***Ключевые слова***: очерк; дискурс; жанр; дискурсный анализ; медиатекст; семиотическое моделирование; прагматика текста.

## PROSPECTS FOR THE STUDY OF THE ESSAY AS A DISCURSIVE GENRE

***Yu. V. Yavinskaya***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: Yu. V. Yavinskaya (yavinska@mail.ru)*

The article substantiates the relevance of studying the essay as a discursive genre. The prospects of comparative research of essays using methods of se-